***А. І. Марэцкі,*** *канд. філасофскіх навук,*
*праф. каф. філасофіі БДУКМ*

# ПРАБЛЕМА ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ Ў ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ

Феномен гістарычнай памяці ўсё больш прыцягвае ўвагу даследчыкаў. Яны падкрэсліваюць, што фарміраванне гістарычнай памяці і патрыятычнае выхаванне чалавека прадстаўляюць ўзаемаабумоўлены і ўзаемасувязны працэс, што гістарычная памяць прабуджае ў чалавеку высокія грамадзянскія пачуцці, у тым ліку любоў да радзімы.

Прычына даследавання гэтай праблемы выцякае з асаблівасцей нашага часу, калі глабалізацыя сусветных працэсаў, інтэрнацыяналізацыя культурных зносін, стварэнне мультымедыйнай культуры і іншае выклікаюць магутныя інфармацыйныя патокі, якія могуць выцесніць асновы культурнай самабытнасці народа. Таму актуальным з’яўляецца захаванне нацыянальна-культурнага менталітэту, што дазваляе нацыі зберагчы сваю цэласнасць.

Якія ж сімвалы нацыі з’яўляюцца тымі, што аб’ядноўваюць? Па-першае, гэта агульная гісторыя. Такія вялікія падзеі, як перамога ў Вялікай Айчыннай вайне, безумоўна, аб’ядноўвае народ як нацыю. У гэтай вайне прымалі ўдзел ўсе народы СССР, і сёння памяць аб тых, хто не вярнуўся, аб’ядноўвае ўсіх і адзінай боллю ахвяр і адзіным пачуццём гордасці за перамогу.

Па-другое, нацыю аб’ядноўваюць дасягненні ў вобласці навукі і новых тэхналогій, літаратуры і мастацтва, спорта, удзел у міжнародных культурных праектах, конкурсах, прычым не толькі ў сферы высокай культуры, але і ў культуры масавай. Гэтыя дасягненні, безумоўна, фарміруюць агульны эмацыянальны фон развіцця народаў.

Па-трэцяе, для фарміравання ў масавай свядомасці ўстойлівых агульнанацыянальных вобразаў, звязаных з нацыянальнымі святынямі і сімваламі, неабходна прадуманая і выстраеная сістэма інстытутаў, перш за ўсе інстытутаў дзяржаўнай адукацыі – школьнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай, – дзе можа эфектыўна фарміравацца ўстойлівы пазітыўны вобраз сваёй краіны. Таму гэта сістэма павінна быць цэнтралізаванай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па-чацвёртае, з’яднаючым фактарам з’яўляецца этнакультура (фальклор, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, абрады і святы), якая мае вялікае значэнне для зацвярджэння індэнтычнасці.

Па-пятае, безумоўна, беларуская мова, якая з’яўляецца асновай, матрыцай станаўлення і развіцця культуры.

Фарміраванне гістарычнай памяці з’яўляецца адной з асноўных стратэгій развіцця культуры на сучасным этапе. Работа ў гэтым кірунку павінна быць комплекснай і ахопліваць ўсю паўнату духоўна-культурнага багацця, якое створана народам. Улічваючы цяжкасці з матэрыяльным забяспячэннем захавання культурнай спадчыны, магчымасцей яе папулярызацыі трэба звярнуць увагу на неабходнасць работы на тых напрамках, што паспрыяюць рашэнню гэтага пытання.

Калі сёння глабалізацыя як сацыякультурны выклік сучаснай эпохі пашырае свае межы, то ствараецца дваістая па змесце сітуацыя: з аднаго боку, неабходна рэальнае засваенне набыткаў народаў свету, у тым ліку культурных, а з другога – зберажэнне і развіццё набыткаў нацыянальнай культуры, без гістарычнай памяці такое немагчыма: пераемнасць традыцый культурнай спадчыны будзе нерэалізавана, а пытанне аб адраджэнні адпадае само па сябе.

Талерантнасць беларусаў спрыяе хуткаму засваенню сучасных сусветных навацый, якія набліжаюць да перадавых дасягненняў ў сферы інфармацыі. Разам з тым існуе пагроза засваення самых лепшых узораў культурных дасягненняў. Каб інтэгратыўныя працэсы не размылі сацыякультурную цэласнасць беларускага этнасу, неабходна захоўваць асновы яго самабытнасці, нацыянальна-культурнай адметнасці, прадухіліць пагрозу сацыяльна-этнічнай індыферэнтнаці. Культурная самабытнасць не можа існаваць без гістарычнай памяці – разуменне сваёй тоеснасці адэкватна ўяўленню аб векапомных шляхах, якімі прайшоў народ.

Кансалідацыі грамадства дапамагае адчуванне сваёй культурнай самабытнасці. Праблема кансалідацыі абвастраецца, калі бярэ разгон дыялог культур, вынікам якога могуць быць і негатыўныя праявы касмапалітызму, духоўнага нігілізму. Успрыняць пазітыўнае ў такіх выпадках дапамагае адчуванне свае годнасці, шанаванне нацыянальных сімвалаў, паглыбленне ведаў аб падзеях, краіне, веданне дзейнасці народных герояў. Тут становіцца магчымым засваенне агульначалавечых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасцей пры захаванні нацыянальнай культуры і сваіх каштоўнасцей.

Гістарычнай памяці садзейнічае таксама самаідэнтыфікацыя народа. Усведамленне прыналежнасці да свайго народа надае імпульс пачуцця ўдзячнасці яму, адчуванне сваёй тоеснасці ў мультыкультурным свеце. Пры адсутнасці гэтага ўсведамлення парушаецца сацыяльнае самаадчуванне, культурна-духоўная індыферэнтнасць.

Сучасная глабалізацыя надае сусветнай супольнасці патранаж заходніх стандартаў. Аднак гэтая сітуацыя сустракае магутнае супраціўленне з боку іншых супольнасцей. Наяўнасць нацыянальнага менталітэту дае магчымасць знайсці пункт апоры і плённа працаваць на ніве роднай культуры. Гістарычная памяць дапамагае зазірнуць у мінулае, знайсці адпаведныя аналогіі, уясніць спецыфіку існуючай сітуацыі.

Значыць, гістарычная памяць – гэта не толькі знаёмства з мінулым беларускага народа, гэта комплексны спектр з'яў, які складае сацыяльная дынаміка жыцця народа, яго культурныя набыткі, самаідэнтыфікацыя, пачуццё сваёй самабытнасці і адметнасці.

Таму праблема фарміравання гістарычнай памяці актуальна для студэнцкай моладзі ва ўмовах атрымання вышэйшай адукацыі. Адзначым цэнтральную з метадалагічных прадумоў рашэння праблемы – падыход да фарміравання гістарычнай памяці як кіруемаму, педагагічна накіраванаму працэсу. У яго аснове ляжаць агульныя прынцыпы педагогікі: адзінства навучання і выхавання, уключэнне студэнтаў у практычную дзейнасць у ходзе засваення ведаў, улік індывідуальных асаблівасцей, выкарыстанне педагагічных метадаў, якія стымулююць пазнавальную дзейнасць і творчае засваенне вопыту папярэдніх пакаленняў.

Разам з тым, гэты працэс мае і сваю спецыфіку, якая выцякае з сутнасці гістарычнай памяці. У сукупнасці засвойваемых студэнтамі ведаў прыярытэт належыць гуманітарным, атрыманым з гісторыі, літаратуры, археалогіі і іншых навук. У выпадку разгляду фарміравання гістарычнай памяці як умовы выхавання ў студэнтаў патрыятычных пачуццяў важнае значэнне мае адбор гістарычнага матэрыялу, яго аб'ектыўны аналіз, акцэнт на лепшае з мінулага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самастойная работа над гістарычным матэрыялам стымулюе развіццё асабістай ацэнкі мінулага, прывучае да аналітычнага мыслення, пошуку дадатковых звестак, аналізу існуючых ведаў аб мінулым, тым самым прыцягненню студэнтаў да навукова-даследчай работы.

Рамкі дадзенага артыкула не дазваляюць грунтоўна раскрыць багаты матэрыял, які напрацаваны агульнаадукацыйнымі і спецыяльнымі кафедрамі, таму абмяжуемся наступным. Так, у прыватнасці ў выкладанні курса гісторыі Беларусі ўжо ў фарміраванні раннефеадальных дзяржаўных утварэнняў на яе тэрыторыі непасрэдную зацікаўленасць прадстаўляе асветніцкая дзейнасць Ефрасінні Полацкай, Кірыла Тураўскага, Клімента Смаляціча. У часы Вялікага Княства Літоўскага значную цікавасць выклікаюць рэнесанса-гуманістычныя ідэі такіх асветнікаў, як Францішак Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Мялецій Сматрыцкі, Ян Намыслоўскі. Таксама з гэтым перыядам звязана напісанне М. Гусоўскім «Песні пра зубра», развіццё барока, манументальнага і станкавага жывапісу, кніжнай і станкавай гравюры.

Беларуская гісторыя багата прозвішчамі, далёка вядомымі за яе межамі. У сферы тэатра, музыкі, літаратуры – гэта, напрыклад, творчасць Міхала Казіміра Агінскага і Міхала Клеафаса Агінскага, Я. Чачота, Т. Зана, Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча і інш.

З пакалення ў пакаленне беларусы павінны захоўваць памяць аб бітвах Вялікай Айчыннай вайны, аб перажытым іх удзельнікамі. Многія гэтыя падзеі сталі сімваламі чалавечага супрацьстаяння ваеннаму вераломству (абарона Брэсцкай крэпасці, бітва на Буйніцкім полі, партызанскі і падпольны рух на акупаванай тэрыторыі і інш.).

Багаты матэрыял прадстаўляюць таксама спецыяльныя дысцыпліны – міфалогія, фальклор, этналогія, этнаграфія, гісторыя мастацтваў, гісторыя свят, традыцыйная святочная культура беларусаў, гісторыя краязнаўства і краязнаўчай літаратуры і многія іншыя.

Працэс фарміравання гістарычнай памяці не абмяжоўваецца толькі рамкамі вучэбных заняткаў. Студэнты прымаюць актыўны ўдзел у рабоце навуковых лабараторый, круглых сталоў, фальклорных экспедыцый, студэнцкіх навуковых канферэнцый. Сярод шэрагу дакладаў на выніковай навуковай канферэнцыі, што прайшла ў красавіку 2013 г. мелі месца і тыя, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пэўным чынам звязаны з фарміраваннем гістарычнай памяці. У якасці прыклада назавём наступныя: «Купалле: традыцыі і навацыі», «Зімовыя і веснавыя святы в. Радзюкі Шаркаўшчынскага раёна», «Тэма Радзімы ў паэме Я. Купалы «Яна і я», «Развіццё мастацкага збіральніцтва на Беларусі ў XVI – пачатку XX ст.» і інш.

Правядзенне навуковых канферэнцый дазваляе студэнтам выйсці са сваімі дакладамі, у якіх абагульнены матэрыялы, сабраныя ў працэсе напісання рэфератаў, курсавых і дыпломных работ, на больш шырокую аўдыторыю.

Фарміраванню гістарычнай памяці садзейнічае мастацка-творчая дзейнасць студэнтаў. Студэнты мастацкіх спецыялізацый прымаюць актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні культурных мерапрыемстваў ва ўніверсітэце, розных установах культуры, на прадпрыемствах, у сельскай мясцовасці. Так, кафедра рэжысуры абрадаў і свят арганізуе правядзенне свят, якія ўзыходзяць да векавых традыцый народа, такіх як Новы год, Масленіца, Купалле і іншым, звязаным з памятнымі датамі ў гісторыі краіны (напрыклад, Дзень Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, Дзень абаронцы Айчыны і іншыя). Студэнты пішуць сцэнарыі, выступаюць у якасці рэжысёраў, акцёраў. Мастацка-творчае засваенне студэнтамі падзей мінулых гадоў дае новы імпульс развіццю гістарычнай памяці.

Умелае спалучэнне розных форм работы студэнтаў – вучэбнай, навуковай, мастацка-творчай – падпарадкована адной мэце – фарміраванню гістарычнай памяці і выхаванню патрыятычных пачуццяў, ускарае працэс асабістага развіцця студэнтаў.

---

1. *Каргин А. С.* Этнокультура как фактор национальной идентичности // Традиционная культура / А. С. Каргин, А. В. Костина. – 2011. – № 1. – С. 34–46.

2. *Скворцов, Л. В.* Метаморфозы исторической памяти: культурологический аспект / Л. В. Скворцов // Культурология: дайджест. – 2009. – № 2. – С. 133–138. – № 3. – С. 154–203.

3. *Яновіч, С.* Без пачуцця Айчыны няма развіцця / С. Яновіч // Беларусь – XXI ст.: нацыянальна-культурнае і духоўнае развіццё: матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 10–12 снежня 2003 г. – Мінск : ННАЦ імя Ф.Скарыны, 2004. – С. 152–157.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ